**Макаранка, Д.** Заслужаны сын Браслаўшчыны / Д. Макаранка // Браслаўская звязда. — 2012. — 27 снеж. — С. 1.

## ЗАСЛУЖАНЫ СЫН БРАСЛАЎШЧЫНЫ

У Савецкім Саюзе 80 гадоў таму назад у пагранічных войсках былі створаны авіяатрады. З моманту ўзнікнення і па сённяшні дзень лётчыкі-пагранічнікі з гонарам выконваюць свой воінскі абавязак па ахове дзяржаўнай мяжы.

Выратаванне чалюскінцаў, удзел у Вялікай Айчыннай вайне, у час якой васямнаццаці лётчыкам-пагранічнікам прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, баявыя дзеянні ў раёне вострава Даманскі, Афганістане, «гарачых кропках» пасля распаду Савецкага Саюза, ахова мяжы Рэспублікі Беларусь – гэта асноўныя вехі ў гісторыі пагранічнай авіяцыі. Яе творцамі з'яўляюцца людзі, якія сваё жыццё прысвяцілі нялёгкай справе – абароне Радзімы.

Адным з іх з'яўляецца першы начальнік авіяцыі ў гісторыі пагранічных войскаў Рэспублікі Беларусь палкоўнік запасу Эдуард Пятровіч Сяргун.

Нарадзіўся будучы авіятар у в. Далёкія. З дзяцінства хлопчык марыў стаць ваенным. Пасля школы яго мара здейснілася, і ён паступіў у Сызранскае ваеннае вучылішча. Пасля яго заканчэння пачалася служба ў пагранічных войсках.

За дзевяць гадоў службы ў эскадрыллі, якая базіравалася каля г. Алма-Аты, Э. Сяргун асвоіў палёты па горнай мясцовасці, пошук, нясенне дазору і патрульнай службы, лятаў у паветранную разведку, высаджваў і здымаў пагранічныя пасты, займаўся навучаннем і выхаваннем асабістага саставу.

Пасля Ваенна-палітычнай акадэміі быў назначаны намеснікам камандзіра асобнай эскадрыллі па палітычнай частцы, а праз некалькі год стаў начальнікам палітаддзела асобнай эскадрыллі ў авіяцыйным палку.

Ваенны лётчык першага класа, улюбёны ў неба, Э. Сяргун замест цішы свайго кабінета аддаваў перавагу працы з лётным саставам на аэрадроме, на аператыўных кропках, у баявых аперацыях. Веданне ваеннай справы і жаданне непасрэдна ўдзельнічаць у баявым жыцці эскадрыллі садзейнічалі назначэнню на пасаду начальніка авіяцыйнага аддзялення аператыўнай групы сярэднеазіяцкай пагранічнай акругі ў г. Душанбэ. Удзельнічаў у планіроўцы, падрыхтоўцы і правядзенні некалькі дзясяткаў буйных пагранічных афганскіх аперацый па знішчэнні незаконных бандыцкіх фарміраванняў.

Калі Э. Сяргун кіраваў авіяцыйнай групай планавага вываду на радзіму асабістага саставу, тэхнікі і вайсковай маёмасці з чарговай кропкі Афганістана, моцна перагружаны верталёт пры ўзлёце з высакагорнай пляцоўкі атрымаў пашкоджанне, ударыўся аб схіл гары і зламаў шасі. Нягледзячы на гэта, Э. Сяргун змог даляцець да аэрадрома і пасадзіць верталёт на скрыні ад снарадаў. Жыццё экіпажа і дэсантнікаў было выратавана.

У апошні час сваёй службы, з 1994 па 1997 гады, палкоўнік Э.Сяргун з'яўляўся камандуючым авіяцыі пагранвойскаў Рэспублікі Беларусь.

Апошнія гады жыцця правёў на сваёй малой радзіме ў агр. Опса, дзе з пашанай пахаваны 15 снежня 2012 года.

**Д. Макаранка**,
нам. начальніка аддзела пагранічнай службы «Опса»